ли воинскую службу белорусы, русские, украинцы, представители других многочисленных наций и народностей СССР. Прочность братской дружбы белорусов, русских, украинцев, других наций и народностей, а это значит всего многонационального советского народа, подтвердила Великая Отечественная война.

ЛИТЕРАТУРА


1. **Накануне** : Западный особый военный округ (конец 1939 г. – 1941 г.) : док. и материалы / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2007. – 662 с.
2. **Подъячих, П. Г.** Всесоюзная перепись населения 1939 года (методология и организация проведения переписи и разработки итогов) / П. Г. Подъячих. – Москва : Госстатиздат, 1957. – 109 с.
3. **Российский** государственный архив экономики (РГАЭ). – Ф. 1562. Оп. 329. Д. 19.
4. **РГАЭ**. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 257.
5. **РГАЭ**. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 375.
6. **РГАЭ**. – Ф. 1562. Оп. 336. Д. 995.
7. **Старовойтов, М. И.** Естественное движение населения белорусско-российско-украинского пограничья во второй половине 1920-х – 1930-е годы / М. И. Старовойтов // Известия Гомельского госуниверситета имени Ф. Скорины. – 2010. – № 6. – С. 182–192.
8. **Старавойтаў, М. І.** Колькасны і нацыянальны склад насельніцтва абласных цэнтраў беларуска-расійска-ўкраінскага памежжа напярэдадні Другой сусветнай вайны / М. І. Старавойтаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2024. – № 8. – С. 36–43.
9. **Старовойтов, М. И.** Национальный и социальный состав военнослужащих Белорусского военного округа накануне Второй мировой войны / М. И. Старовойтов // Идеологические аспекты военной безопасности : науч.-практ. прил. к журн. «Армия» М-ва обороны Респ. Беларусь. – 2018. – № 1. – С. 8–15.
10. **Старовойтов, М. И.** Титульные этносы кавказских и среднеазиатских республик в составе населения белорусско-российско-украинского пограничного региона в 1920–1930-е годы / М. И. Старовойтов // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2019. – № 1. – С. 39–44.


***Субоцін А.А.*** *(г. Віцебск)*

# АРГАНІЗАЦЫЯ І СТРУКТУРА ГАНДЛЁВАЙ РОЗНІЧНАЙ СЕТКІ ТАРГСІНА НА ВІЦЕБШЧЫНЕ (1932–1936)

Стварэнне Таргсіна (Усесаюзнага аб’яднання па гандлі з замежнікамі) было звязана з пошукамі новых крыніц фінансавання фарсіраванай індустрыялізацыі ў савецкай краіне. Праз сістэму Таргсіна для савецкіх грамадзян адкрывалася магчымасць легальна здаваць каштоўнасці і іншаземную

валюту, атрымліваць грашовыя пераводы з замежных краін ад сваякоў і здзяйсняць за кошт гэтага пакупкі дэфіцытных тавараў у крамах аб'яднання.

Таргсін у БССР з'явіўся ў 1931 г. з адкрыццём яго Беларускай канторы, а на тэрыторыі Віцебшчыны пачаў сваю дзейнасць у наступным 1932 г.: Віцебскае аддзяленне Таргсіна было адкрыта ў студзені, а ў сакавіку таго ж года пачаў функцыянаваць яго першы ўнівермаг. Ён складаўся з мануфактурнага, галантарэйнага і бакалейнага аддзелаў са сваім штатам прадаўцоў. У штатным раскладзе крамы прадугледжвалася нават наяўнасць швейцара [4, арк. 1, 8]. Фармальна дзейнасць Таргсіна была разлічана на абслугоўванне замежнікаў, але асноўнымі пакупнікамі ўнівермага сталі жыхары Віцебска і бліжэйшых населеных пунктаў. Акрамя таго, пры краме дзейнічаў скупачны пункт, куды мясцовае насельніцтва здавала золата ў выглядзе манет царскай чаканкі і бытавых рэчаў, за што атрымлівала ордары, якія ў далейшым можна было атаварыць ва ўнівермагу [3, арк. 14].

Пачынаючы з канца красавіка 1932 г. да Віцебскага аддзялення Таргсіна для поўнага абслугоўвання і кіравання быў прымацаваны гандлёвы павільён на чыгуначнай станцыі Бігосава. Павільён быў разлічаны пераважна на гандаль з замежнікамі, якія прыбывалі сюды транзітам [2, арк. 11].

У пачатку мая 1932 г. універмаг і скупачны пункт сістэмы Таргсіна пачаў сваю дзейнасць у Полацку. Першапачаткова крама гэтага горада падпарадкоўвалася непасрэдна Беларускай канторы Таргсіна, а з ліпеня 1932 г. перайшла пад кіраванне Віцебскага аддзялення Таргсіна, якое павінна было забяспечваць полацкую краму таварамі, ажыццяўляць нагляд за гандлем, прымаць фінансавыя справаздачы [2, арк. 180]. Да лета 1932 г. таксама быў адкрыты ўнівермаг у Оршы, які напрамую падпарадкоўваўся Беларускай канторы [1, с. 4].

Для лепшай арганізацыі гандлю і змяншэння бюракратычных працэдур Віцебскае аддзяленне Таргсіна ў верасні 1932 г. было рэарганізавана ва ўнівермаг, які адпаведна станавіўся і структурнай адзінкай, і гандлёвай кропкай [4, арк. 12]. Яшчэ адной мерай па паляпшэнні дзейнасці ўнівермагаў стала стварэнне пры іх з лістапада 1932 г. кантрольных сталоў, куды перадаваліся тавары прадаўцамі ўсіх аддзелаў, і дзе паўторна правяралася адпаведнасць гэтых тавараў кошту прадстаўленых квітанцый і таварных ордараў. Толькі пасля гэтага тавары перадаваліся пакупніку [4, арк. 15].

На 1933 г. кіраўніцтва СССР і БССР паставіла для сеткі Таргсіна новыя гандлёва-фінансавыя планы, якія прадугледжвалі павышэнне паказчыкаў здачы золата, паступлення валютных каштоўнасцей і павелічэнне аб'ёмаў рэалізацыі тавараў. У сувязі з гэтым у адзначаны год былі праведзены структурныя змены ў гандлёвай сетцы Таргсіна ў БССР, у тым ліку і на Віцебшчыне. 28 студзеня 1933 г. у Віцебску зноў было ўтворана аддзяленне Таргсіна [4, арк. 15]. Акрамя раней адчыненых універмагаў і крамаў сваю працу пачалі новыя гандлёвыя кропкі сістэмы. Так, у пачатку лютага 1933 г. у Ві-

цебску быў адкрыты ўнівермаг № 2, які складаўся з галантарэйна-мехавага, мануфактурнага і бакалейнага аддзелаў. Таксама пры ім быў арганізаваны асобны скупачны пункт і мучны склад. Пазней з універмага № 2 была вылучана спецыялізаваная мясная крама Таргсіна № 3 [4, арк. 16]. У чэрвені 1933 г. быў адкрыты ўнівермаг № 4, што складаўся з прамтаварнай, бакалейнай секцый і скупачнага пункта [4, арк. 25 адв.].

Для аператыўнага абслугоўвання пакупнікоў на перыферыі і больш эфектыўнай арганізацыі скупкі каштоўнасцей на месцах новыя гандлёвыя кропкі разам з прымацаванымі да іх скупачнымі пунктамі адкрыліся ў 1933 г. у іншых гарадах і мястэчках Віцебшчыны: у Гарадку – 20 красавіка, у Бешанковічах – 22 красавіка (да Бешанковіцкага аддзялення Таргсіна быў таксама прымацаваны асобны кіёск у мястэчку Ула), у Дрысе – 18 ліпеня [7, арк. 4].

Безумоўна, што такое пашырэнне гандлёвай сеткі Таргсіна патрабавала змен у яго кіраўнічай структуры. Па ўсёй рэспубліцы пачынаюць ствараецца міжраённыя базы. У прыватнасці, Віцебская міжраённая база Таргсіна была створана 5 жніўня 1933 г. Ёй тэрытарыяльна падпарадкоўваліся гандлёвыя кропкі не толькі ў Віцебску, але і ў Полацку, Бігосава, Гарадку, Бешанковічах, Уле, Дрысе [4, арк. 37 адв.]. 22 кастрычніка 1933 г. у склад Віцебскай міжраённай базы ўвайшоў адчынены ўнівермаг Таргсіна ў Сянно, 5 лістапада – Лёзненскі ўнівермаг, а 14 лістапада – Суражскі ўнівермаг [7, арк. 4]. Таксама ў снежні 1933 г. у Віцебску дадаткова была адкрыта харчовая крама № 5 [8, арк. 90].

Асобная міжраённая база Таргсіна была створана ў Оршы [1, с. 4]. Наяўныя архіўныя звесткі не дазваляюць пакуль сцвярджаць, якія гандлёвыя кропкі падпарадкоўваліся дадзенай структурнай адзінцы.

Як бачым, за 1933 г. на Віцебшчыне была створана разгалінаваная гандлёвая сетка Таргсіна, крамы якой былі адкрыты амаль у кожным раённым цэнтры. Гэта дазволіла актывізаваць продажы тавараў і прыцягнуць значную колькасць золата і срэбра, якія мясцовае насельніцтва несла ў скупачныя пункты і набывала за кошт іх прадукты харчавання і рэчы штодзённага ўжытку. Напрыклад, за 1933 г. па Віцебскай міжраённай базе Таргсіна было скуплена золата на суму 273 728,79 «таргсінаўскіх» руб., што складала 184,2 кг гэтага каштоўнага металу ў яго чыстым выражэнні, срэбра скуплена на суму 92 283,78 «таргсінаўскіх» руб., замежнай валюты паступіла на суму 46 856,09 «таргсінаўскіх» руб., грашовых пераводаў з-за мяжы атрымана на суму 176 461,81 «таргсінаўскіх» руб., а тавараў рэалізавана на суму 551 722,77 «таргсінаўскіх» руб. [5, арк. 20].

1933 г. стаў пікам дзейнасці Таргсіна па СССР, калі былі дасягнуты максімальныя аб'ёмы скупкі каштоўнасцей, атрымання валюты і рэалізацыі тавараў. Наведвальнікі крамаў Таргсіна ў гэты час набывалі пераважна тавары харчовай групы, дзе абсалютны працэнт рэалізацыі прыходзіўся на прадук-

ты хлебна-фуражнага кірунку. Такія абставіны былі звязаны з нарастаннем крызіснай сітуацыі ў забеспячэнні насельніцтва харчаваннем, а ў некаторых мясцовасцях і з выпадкамі голаду. З восені 1933 г. харчовае забеспячэнне насельніцтва пачынае паляпшацца і адпаведна ідзе паступовы спад актыўнасці жыхароў Віцебшчыны па наведванні Таргсіна. З другога боку, асноўную масу сваіх асабістых зберажэнняў у выглядзе золата і срэбра насельніцтва ўжо здала ў скупачныя пункты. Таму на працягу чацвёртага квартала 1933–1934 гг. аб'ёмы продажаў па сетцы Таргсіна ўпалі ў сярэднім на 60%, што прывяло да закрыцця ў 1934 г. універмагаў па асобных раённых цэнтрах Віцебшчыны і ліквідацыі 15 лістапада 1934 г. Віцебскай міжраённай базы. Пасля ліквідацыі базы крамы гэтай структурнай адзінкі, якія яшчэ працягвалі сваю дзейнасць, былі выведзены з падпарадкавання Віцебска. Так, полацкі ўнівермаг Таргсіна перайшоў пад непасрэднае кіраўніцтва Беларускай канторы, а сенненскі ўнівермаг – Аршанскага аддзялення Таргсіна. Замест рэарганізаванай Віцебскай міжраённай базы зноў было ўтворана Віцебскае аддзяленне Таргсіна з галаўным універмагам, якому падпарадкоўваліся ўсе крамы дадзенай гандлёвай сістэмы ў Віцебску [6, арк. 67 – 67 адв.].

На працягу 1935 г. аб'ёмы продажаў і валютных паступленняў па-ранейшаму заставаліся невысокімі, што, адпаведна, прыводзіла да чарговага закрыцця крамаў. Так, у Віцебску на пачатак 1935 г. засталося толькі два ўнівермагі Таргсіна. Спаду пакупніцкай актыўнасці спрыяла таксама і адмена ў адзначаны год карткавай сістэмы на харчовыя тавары.

14 лістапада 1935 г. СНК СССР сваёй пастановай прыняў рашэнне аб прыпыненні дзейнасці Таргсіна да 1 лютага 1936 г., а прыём каштоўных металаў ад насельніцтва быў завершаны [10, с. 288]. Пасля адмены карткавай сістэмы на прамысловыя тавары лёс Таргсіна быў вырашаны канчаткова: у студзені 1936 г. крамы гэтай гандлёвай сеткі па Віцебшчыне ліквідуюцца, а іх актывы, пасівы і маёмасць перадаюцца Беларускаму аб'яднанню дзяржаўнага рознічнага харчовага гандлю і Беларускаму дзяржаўнаму гандлёваму прадпрыемству [9, арк. 22].

Такім чынам, Таргсінам на тэрыторыі Віцебшчыны была створана разгалінаваная сетка крам, якая пачала сваю кароткую гісторыю існавання ў 1932 г. і дасягнула піку развіцця ў 1933 г., калі былі заснаваны Віцебская міжраённая і Аршанская міжраённая базы, якім падпарадкоўваліся больш дробныя гандлёвыя кропкі ў асобных населеных пунктах. Пасля паляпшэння сітуацыі з харчовым забеспячэннем насельніцтва і вычэрпвання ў яго дзяржавай асноўных запасаў каштоўных металаў па рэгіёне назіраўся спад цікавасці пакупнікоў да крам Таргсіна. Гэта, адпаведна, прывяло да ліквідацыі большасці гандлёвых кропак і міжраённых баз у 1934 г., а ў далейшым да канчатковага прыпынення дзейнасці адзначанай гандлёвай сеткі ў пачатку 1936 г.

ЛІТАРАТУРА

1. **Гужалоўскі, А. А.** Аперацыя «Таргсін»: невядомая старонка гісторыі індустрыязацыі ў БССР / А. А. Гужалоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2021. – № 9. – С. 3–10.
2. **Дзяржаўны** архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 5.
3. **ДАВц**. – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 10.
4. **ДАВц**. – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 12.
5. **ДАВц**. – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 41.
6. **ДАВц**. – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 150.
7. **ДАВц**. – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 160.
8. **ДАВц**. – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 211.
9. **ДАВц**. – Ф. 940. Воп. 1. Спр. 213.
10. **Осокина, Е.** Алхимия советской индустриализации: время Торгсина / Е. Осокина. – Москва : Новое лит. обозрение, 2019. – 342 с.

***Титова Н.И.*** *(г. Витебск)*

## СЕМЬЯ БРОЗИ

Витебск – город фестивалей. В дни их проведения требуется сделать все, чтобы гости нашего города захотели еще много раз вернуться сюда. Знакомство с городом начинается с гостиниц. А как это сделать, учит история семьи Брози, которая долгие годы занималась гостиничным бизнесом. Мы редко задумываемся о том, насколько удивительная и уникальная жизнь каждого человека. Каждый день, каждая минута, каждое мгновение проходит и не возвращается никогда.

В 1837 г. в Витебске появилась семья 23-летнего швейцарца Христиана Егоровича Брози, искателя счастья и успеха. Именно в нашем городе он сумел ухватить за хвост свою птицу счастья. Что побудило молодого человека искать новую родину, вместе с семьей отправиться в далекий и незнакомый край – ответить трудно.

Желая иметь собственный бизнес, он арендовал для открытия гостиницы дом купчихи Федоры Ордынской (сейчас – улица Ленина, д. 33).

Были открыты кондитерская и ресторация «Брози». Христиан Егорович не стремился поразить воображение публики. Из поколения в поколение в его семье передавались рецепты торта «Наполеон» и песочного торта «Александр» (назван в честь российского императора Александра) с корицей и брусникой. К столу постояльцев Брози также подавали именной крендель из дрожжевого заварного теста, шарлотку с яблоками, мясо с кислым брусничным вареньем. По свидетельству Ольги Александровны Артеменко, торт